Генеральная пракуратура
Рэспублікі Беларусь
**ПРАКУРАТУРА
МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ**
вул. Шчадрына, 1, 220053, г. Мінск
тэл. 203 53 28, факс. 283 18 70
E-mail: minsk@prokuratura.gov.by
www.prokuratura.gov.by

Генеральная прокуратура
Республики Беларусь
**ПРОКУРАТУРА
МИНСКОЙ ОБЛАСТИ**
ул. Щедрина, 1, 220053, г. Минск
тел. 203 53 28, факс. 283 18 70
E-mail: minsk@prokuratura.gov.by
www.prokuratura.gov.by

19.03.2018 № 07-68-2018
На № _______ ад _________

Лапіцкаму А.І.

AlaksiejLapicki@gmail.com

Пракуратурай Мінскай вобласці разгледжаны Ваш зварот аб нязгодзе з растлумачэннем пракурора г. Жодзіна ад 28.02.2018 на Ваш зварот па пытаннях парушэння выбарчага заканадаўства ад 27.02.2018.

У адпаведнасці з п. 11 ч. 1 арт. 44 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь разгляд заяў і скарг па пытаннях падрыхтоўкі выбараў, арганізацыі галасавання, падліку галасоў аднесена да кампетэнцыі ўчастковай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Згодна п. 26 ч. 1 арт. 33 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў (далей – Центральная камісія) ў граніцах сваёй кампетэнцыі разглядае скаргі на рашэнні выбарчых камісій і выносіць па іх рашэння.

Ваш зварот па пытанных парушэння выбарчага заканадаўства участковай выбарчай камісіяй Будаўнічага выбарчага ўчастка № 9 у г. Жодзіна разгледжаны Цэнтральнай камісіяй, якой Вам 23.02.2018 накіраваны адказ аб адхіленні Вашых патрабаванняў.

Згодна ч. 5 арт. 33 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь у выпадку нязгоды з рашэннем Цэнтральнай камісіі такое рашэнне можа быць абскарджанна ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь.

У частцы пытання аб прытрымліванні тэрмінаў пры разглядзе Вашага звароту паведамляю, што растлумачэнне на Ваш зварот пракуратурай г. Жодзіна накіравана 03.03.2018, што пацвярджаецца рэестрам адпраўкі карэспандэнцыі пракуратуры ад 03.03.2018.

У сувязі з выкладзеным, пракурорам г. Жодзіна Вам абгрунтавана і ва ўстаноўлены заканадаўствам тэрмін растлумачаны парадак абскарджання рашэння Цэнтральнай камісіі. Падстаў для прыняцця мер пракурорскага рэагавання па Вашым звароце не маецца.

Пры нязгодзе з сапраўдным адказам Вы маеце права абскардзіць яго пракурору Мінскай вобласці.

Першы намеснік
пракурора Мінскай вобласці Б.Б.Пятроўскі